# З НОВЫМ 2000 ГОДАМ!


# Гродзенскі УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

Выдаецца з 1986 года ● № 11 (272) ● 31 снежня 1999 года, пятніца

Выходзіць адзін раз на месяц ● Распаўсюджваецца бясплатна




## С ВЕРОЙ В БУДУЩЕЕ!

**И.МАРТЫНОВ,**
**первый проректор по учебно-воспитательной работе и социальным вопросам**

**Наступает Новый год. Год во многом необычный: последний год века, последний год тысячелетия, високосный, год олимпийских игр, год 60-летия нашего университета... Невольно веришь, что он принесет благо каждому из нас и университету в целом. В каких условиях мы стартуем в Новый год, т.е. с какими итогами мы завершаем 1999-й? Прежде всего отметим, что наш университетский коллектив превысил десять с половиной тысяч человек. На 01.12.1999 г. у нас студентов стало 9360 чел. (из них 6090 чел. обучаются на дневной форме, 3193 - на заочной и 77 - на вечерней). Из всего числа студентов около 40% обучаются на платной основе. Преподавателей и сотрудников в университете свыше 1300 чел., из них 634 штатных преподавателя (профессоров - 31, докторов наук - 29, доцентов - 171, кандидатов наук - 241). В 1999 году защищено 2 докторские и 14 кандидатских диссертаций (из них 3 - досрочно, причем одна - на первом году обучения в аспирантуре и еще одна точно в срок). Следует отметить, в работающих при университете трех советах защищено 12 диссертаций, из них 7 - в совете по юридическим наукам, 3 - в совете по физико-математическим наукам, 2 - в совете по культурологии, которые явились первыми в республике. Организованы 3 научно-исследовательские лаборатории, финансируемые за счет внебюджетных средств: региональной эко-**

*(Окончание на 3-й стр.).*




## В XXI ВЕК

**М.ВАСІЛЮЧАК,**
**старшыня савета ветэранаў**

Шаноўныя ветэраны! Вось і скончыўся яшчэ адзін, 1999 год. Згодна з пастановай ААН ён быў годам састарэлых людзей. І наша ветэранская арганізацыя працавала ў напрамку сацыяльнай абароны людзей. Больш за 200 ветэранаў атрымалі матэрыяльную дапамогу як на святы - 23 лютага, 8 сакавіка, 9 мая - так і ў дні юбілееў. Не забыты і тыя, хто ўжо даўно не працуе: ім выдзелілі грошы на нарыхтоўку гароднiны на зіму.

Ад вашага імя хачу сказаць шчыры дзякуй рэктару універсітэта, прафесару С.А.Маскевічу, старшыні прафкама Ул.А.Хілюце, а таксама ўсяму складу рэктарата і прафкама за клопаты аб ветэранах. А ветэранам жа хачу пажадаць у новым годзе моцнага здароўя, бадзёрасці, добрага самаадчування.

Я хацеў бы, каб наша грамадства ўзяло з сабой у Новы год, як і ў новы век, павагу да старэйшых, шанаванне і клопат аб састарэлых людзях. Бо такі клопат вызначае здароўе грамадства. Няхай жа наша грамадства будзе моцным, чыстым і здаровым!

### ВІНШУЕМ!

**Кіру Аляксееўну СМІРНОВУ** з юбілеем. Жадаем шчасця, моцнага здароўя, поспехаў.

**Савет ветэранаў.**

**В.ЛИОПО,**
**доктор физико-математических наук, профессор**

- В Новый год я взял бы с собой все: и свою работу, и друзей, и, конечно, родных и близких, без которых мы - это не мы. Взял бы и недругов. Без них тоже нельзя: подстегивают, не позволяют расслабиться.

Что пожелал бы? Всем - здоровья. Студентам - видеть обычное в необычном и необычное - в обычном. Коллегам - творческого отношения к делу. И еще - никогда не говорить: «Это не мои проблемы...»

### З НОВЫМ ГОДАМ!

**П.МАЛЯЎКА,**
**дацэнт кафедры беларускай літаратуры**

Здароўя, радасці, усмешак,
Пад елку - поўны мех пацешак
Хай Дзед Мароз вам прынясе.
Каб станавіцца нам мудрэй,
Душой і сэрцам багацей,
І між сабой - дабрэй, святлей!
Жадаем хлеба і да хлеба,
Крынічнае жывой вады,
Шмат сонца і блакіту неба,
Ні грама гора і бяды.
Каб вы знаходзілі ўцеху
У сваіх бацьках, унуках, дзецях!

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

**Нагадваем, калі і каго можна павіншаваць з юбілеем.**

- 1 студзеня - **Эмілію Рыгораўну ВАСІЛЬЧАНКА** - дзяжурную інтэрната №1.
- 4 студзеня - **Тадэвуша Станіслававіча ГЛЯБОВІЧА** - загадчыка лабараторыі кафедры прыкладной оптыкі.
- 6 студзеня - **Вячаслава Аркадзьевіча ПРАНЬКО** - дацэнта кафедры матэматычнага аналізу.
- 8 студзеня - **Алега Іванавіча МІТРОШЫНА** - інжынера ТСН.
- 11 студзеня - **Алену Вітальеўну РУЦКУЮ** - старшага выкладчыка кафедры беларускай літаратуры.
- 13 студзеня - **Віктара Анатольевіча БАДАКА** - вядучага інжынера-электрыка ВЦ.
- 18 студзеня - **Святлану Барысаўну ІВАНЮГА** - старшага выкладчыка кафедры спецыяльнага музычнага інструмента.
- 19 студзеня - **Іну Самсонаўну ЛІСОЎСКУЮ** - выкладчыка кафедры беларускай мовы.
- 23 студзеня - **Івана Іванавіча ЧЫВІЛЯ** - інжынера кафедры агульнай фізікі.

## ЦИТАТА НОМЕРА:

**«Хорошее начало - половина дела».**
**Платон.**

# С ВЕРОЙ В БУДУЩЕЕ!

(Начало на 1-й стр.).

**номики; проблем правотворческой и правоприменительной деятельности; проблем региональной культуры.**

**Осуществляется межвузовский проект «Молодежь как субъект и объект социально-политической трансформации общества» и Гродненская региональная научно-техническая программа «Разработка технологий, технических средств и систем мер, обеспечивающих повышение эффективности функционирования промышленности, сельского хозяйства и социальной сферы Гродненской области».**

**В текущем году в университете выполнялось 60 финансируемых научных тем общим объемом 57 млр.руб., а также межвузовская программа «Динамические системы», по которой головным был наш университет. Такая программа, где головным вузом выступил вуз региона, финансируется Министерством образования впервые.**

**Уже известно, что в следующем году Министерством образования будут профинансированы еще 9 новых научных тем, которые были отобраны для этой цели на конкурсной основе. По инициативе университета осуществляется проект ГИКС, по которому 7 корпусов университета соединены скоростной оптоволоконной сетью, являющейся частью городской информационной кабельной сети. Это даст городу возможность построить «информационное общество» по мировым стандартам, при этом четвертая часть городского кольца будет работать на университет, что обеспечит университету возможность объединения всех 500 персональных компьютеров в единую информационную среду.**

**Ширится спектр специальностей и специализаций, по которым в университете ведется подготовка специалистов. В 1999 году был проведен набор по 32 специальностям дневной формы обучения, по 16 специальностям на обучение без отрыва от производства и по одной - на вечернем отделении. На заочном отделении был прием на новую специальность «Бухгалтерский учет, анализ и аудит», а также впервые в республике совместно с Полоцким университетом открыта подготовка без отрыва от производства по специальностям «Технология, оборудование, автоматизация машиностроения»; промышленное и гражданское строительство; «Теплоснабжение, вентиляция и охрана воздушного бассейна»; водоснабжение, водоотведение, очистка природных и сточных вод». Такую форму сотрудничества университета с вузами республики и других стран предполагается развивать и в последующие годы.**

**Проводится подготовительная работа к открытию в 2000 году новых специальностей: «Дефектология» со специализацией «Олигофренопедагогика, логопедия»; «Социальная педагогика» со специализацией «Воспитательная работа в учебных заведениях», а также в рамках специальности «Биология» специализации «Биотехнология» и в рамках специальности «Экология» специализации «Физико-химический анализ объектов окружающей среды». Надо сказать, что все специальности, по которым ведется подготовка специалистов в университете, высоко котируются в молодежной среде Гродненщины, о чем свидетельствуют высокие конкурсы на вступительных экзаменах.**

**Наряду с достижениями в научной, учебной деятельности университет набирает темпы в повышении общей культуры. Осталось в памяти предновогоднее выступление нашего театра мод, великолепное впечатление от которого предопределило высокую планку, тот уровень культуры, который поддерживался в течение всего года. Останутся в памяти выступления на сценах университета и города студенческого театра эстрадных миниатюр, ансамбля «Каприз», агитбригады матфака, отметившей свое 20-летие, высокий уровень вечеров, посвященных 20-летию юрфака, 40-летию факультета психологии и педагогики, 55-летию физико-математического факультета, заключительного конкурса первокурсников «alma-mater: любовь с первого взгляда», вечера «Мисс университет-99», спортивного вечера...**

**В 1999 году на чемпионатах и первенствах республики завоевано 26 золотых, 10 серебряных, 9 бронзовых медалей, на молодежных первенствах Европы - 2 золотые, 1 бронзовая медаль, на молодежных мировых первенствах - 2 золотые и 2 серебряные медали.**

**Большое внимание ректоратом уделяется социальной сфере. Благодаря расширению внебюджетной деятельности (объем внебюджетных поступлений в 1999 году составил 45,2% от общего бюджета университета) стало возможным более адекватно оценить труд сотрудников университета. Израсходовано на зарплату по бюджету 136322,7 млн. руб, по внебюджету - 83190,5 млн. руб.**

**Средняя зарплата в ноябре 1999 года по университету среди ППС составила 31,5 млн. руб. В 1999 году выплачено премий на сумму 8726,7 млн. руб. по бюджету и 25873,7 млн. руб. по внебюджету, оказана материальная помощь на сумму 8718,1 млн. руб. На приобретение путевок израсходовано 925 млн. руб, что дало возможность оздоровить 154 сотрудника и членов их семей.**

**В соответствии с жилищной программой в текущем году 15 членов нашего коллектива получили безвозмездную помощь для приобретения жилья.**

**Регулярно оказывается материальная помощь неработающим пенсионерам, за что они выражают признательность университету.**

**Проводится капитальный и текущий ремонт общежитий и корпусов университета, на что израсходовано в этом году около 30 млрд. руб.**

**Сделан еще один шаг в развитии финансовой самостоятельности факультетов. Это позволяет университету лучше приспособиться к условиям быстрых изменений в обществе, создавать программы развития, направленные на удовлетворение интересов членов коллектива, мобилизовать внутренние ресурсы на работу в рыночных условиях.**

**Дорогие студенты, аспиранты и коллеги! В этот предновогодний день хочу пожелать Вам успехов и удачи во всех делах, творимых на благо университета, направленных на его процветание. Радуйтесь жизни, радуйтесь повышению авторитета родного университета.**

## МИСС УНИВЕРСИТЕТА-99

Интересно и захватывающе прошел конкурс грации и артистического мастерства «Мисс университета-99», в котором приняли участие 16 конкурсанток. Поздравляем победителей!

Мисс университета стала Алеся Еговцева - студентка I курса филологического факультета; первой вице-мисс жюри признало Ольгу Сокович, студентку исторического факультета, второй вице-мисс - Юлию Павлюкевич, студентку факультета психологии и педагогики, мисс зрительских симпатий - Екатерину Сучок, студентку факультата физической культуры.

## КАКИМ ВАМ ПОКАЗАЛОСЬ УХОДЯЩЕЕ СТОЛЕТИЕ?

**Г.ЗОРИН,**
**доктор юридических наук, профессор**

- В нем было все. Это такой насыщенный век и на положительные, и на отрицательные, разрушительные преобразования общества. Невольно приходит в голову идея преактивизма. Она принадлежит Лао-Цзы и заключается в построении прогноза на то, чего еще нет. Мы опаздываем, потому что не видим противников, которых еще нет, и включаемся в заранее проигранную игру. Примеры? Пожалуйста. Выходя на расследование преступления, мы еще ничего о нем не знаем. А преступник уже этот путь прошел и предусмотрел всевозможные способы защиты от нас. Хотелось бы пожелать всем нам умения прогнозировать. Тогда меньше будет неожиданностей.

## НАВАГОДНІЯ ПАЖАДАННІ

**ВЫКЛАДЧЫКАМ**

Будьце лаканічнымі на лекцыях і тактоўнымі падчас прыёму залікаў і экзаменаў. Нават не спрабуйце выведаць у студэнта тое, аб чым вы яму не казалі. Нікому не верце і ніколі не здзіўляйцеся. Шануйце здароўе - сваё і студэнтаў.

**СТУДЭНТАМ**

Размаўляй з тымі, з кім хацеў бы размаўляць сёння, заўтра - усё жыццё. Думай аб сваёй будучыні. З блізкімі па духу людзьмі задумвай новыя праекты. Спрачайся з далёкімі па духу аб сэнсе, каштоўнасцях і стылі жыцця. Будуй свой унутраны свет.

**ТЫМ, ХТО ЗАЙМАЕЦЦА ВЫХАВАННЕМ**

Выхоўвайце да таго, а не пасля. Звярніце ўвагу на студэнта, асабліва - на студэнтку з цыгарэтай у руках. Як шкада універсітэцкіх прыбіральняў, якія ператварыліся ў курылкі! А які быў еўрарамонт!

# КРОКІ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Н.МІЛЕЙКА,**
**загадчыца Дзятлаўскага раённага аддзела адукацыі**

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя змены, якія адбываюцца сёння ў нашым грамадстве, запатрабавалі новага зместу і структуры адукацыі. Нельга не заўважыць, што зараз актыўна адбываецца рэфармаванне школы, якое актыўна вядзе да з'яўлення гімназій, ліцэяў, каледжаў.

Увогуле рэалізацыя актыўных кірункаў рэформы, вывад дзяржаўнай сістэмы адукацыі на сучасны ўзровень залежыць ад розных фактараў, у тым ліку і ад эфектыўнага ўзаемадзеяння вну і школы. На практыцы гэта ажыццяўляецца праз цесную сувязь, пастаянныя кантакты кафедраў вышэйшых навучальных устаноў з настаўнікамі школ. Гэта вельмі важкі момант, паколькі навукоўцы актыўна дзеляцца сваімі ведамі з настаўнікамі-практыкамі. Больш таго, гэтыя сувязі ажыццяўляюцца праз розныя формы працы: лекцыі, метадычныя семінары ў Інстытуце ўдасканалення настаўнікаў г.Гродна, правядзенне алімпіяд, конкурсаў...

Але найбольш эфектыўным, на маю думку, у гэтым напрамку з'яўляюцца сустрэчы навукоўцаў і настаўнікаў: маецца на ўвазе, калі на пасяджэнні метадычных аб'яднанняў прыязджаюць выкладчыкі кафедраў вну.

Метадычнае аб'яднанне запрашае не толькі з мэтай знаёмства, азнаямлення з новымі праграмамі, але, у першую чаргу, каб пачуць свежае слова, атрымаць змястоўныя адказы на часам няпростыя пытанні літаратурнага жыцця, на сучаснае прачытанне мастацкіх твораў.

Непасрэдны прыклад такога плённага супрацоўніцтва - апошняя сустрэча настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры Дзятлаўшчыны з дацэнтам кафедры беларускай літаратуры Маляўкам Пятром Іванавічам. Пасяджэнне было прысвечана 100-годдзю з дня нараджэння Міхася Ціханавіча Лынькова, народнага пісьменніка Беларусі. Матэрыялаў крытычных, «свежых» старонак прачытання яго творчасці малавата, таму і запрасілі. Запрасілі і не памыліліся. Засталіся задаволенымі, бо адбыўся вельмі шчыры, патрэбны, на працягу пяці гадзін, творчы дыялог, які выйшаў за акрэсленыя тэмай межы.

Міхась Лынькоў і беларуская літаратура... А ў гэтым рэчышчы самыя разнастайныя пытанні, якія датычыліся і новага прачытання класікі, і тэмы гістарычнага мінулага роднага краю ў мастацкім асэнсаванні, і новая трактоўка твораў і імёнаў 20-х—30-х гадоў у нашай літаратуры, пытанне, звязанае з загадкай смерці Янкі Купалы, і багата, багата іншых... І самае галоўнае, што ніхто не стаміўся і не спяшаўся пакінуць зал-аўдыторыю.

Яшчэ хацелася б зазначыць, што гэта не першая сустрэча нашых настаўнікаў з выкладчыкамі ГрДУ імя Янкі Купалы. Гэтая сцежка ўжо апрабавана, бо на працягу года мы плённа супрацоўнічалі і са старшым выкладчыкам кафедры беларускай літаратуры, паэткай, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, Аленай Віталеўнай Руцкай. Засталіся вельмі і вельмі задаволенымі.

Падагульняючы, хочацца сказаць, што вельмі багата запланавана і традыцыйных, і новых форм для супрацоўніцтва на часе сучасных запатрабаванняў рэформы школы і адукацыі. Тым больш, што ў Дзятлаве на сёння працуюць дзве гімназіі, і мы спадзяемся, што нашае супрацоўніцтва будзе працягвацца...

# ИССЛЕДУЕМ ПРОБЛЕМЫ МОЛОДЕЖИ

**Н.ЖУРАВЛЕВА,**
**доцент кафедры культурологии**

На базе университета состоялся межвузовский научно-практический семинар «Молодежь как субъект и объект социально-политической трансформации общества». Семинар подвел итоги научных исследований, проводимых в течение года по одноименному Межвузовскому комплексному проекту, а также наметил перспективы дальнейшей научной работы. В исследованиях принимали участие Гродненский государственный университет (головная организация), Витебский государственный университет (организация-соисполнитель), Белорусский государственный педуниверситет, Белорусская политехническая академия, лаборатория медико-биологического исследования наркологии Гродненского мединститута.

Первые результаты комплексного исследования этих актуальных проблем жизнедеятельности молодежи и были обсуждены на состоявшемся семинаре. С приветственным словом к его участникам выступил проректор по науке ГрГУ профессор В.В.Сенько. Итоги исследований первого этапа Межвузовского комплексного проекта «Молодежь как субъект и объект социально-политической трансформации общества» подвел в своем выступлении руководитель научного проекта, заведующий кафедрой философии ГрГУ, профессор Ч.С.Кирвель. С докладами выступили заведующий кафедрой общественных наук ГГСХИ, доцент Л.Л.Мельникова, заведующий кафедрой политологии и социологии ГрГУ, доцент Е.В.Пиульский, доценты А.А.Бородич, Н.Б.Журавлева. Активное участие в работе семинара приняла делегация Витебского госуниверситета: заведующий кафедрой философии, доцент Э.И.Рудковский, доценты Ф.К.Кунцевич, Б.Я.Шендерович.

Интересное сообщение о наркомании в молодежной среде сделали профессор В.В.Лелевич и старший научный сотрудник А.В.Козловский (лаборатория медико-биологических исследований).

К исследованию молодежных проблем активно привлекаются аспиранты, магистранты и студенты ГрГУ. Некоторые из них также принимали участие в семинаре. С сообщениями выступили О.Романов, аспирант кафедры философии, К.Карпинский, студент 5 курса отделения психологии, и другие.

С докладом «Политика и молодежь» выступил второй секретарь Гродненского обкома БСПМ В.М.Миронцов.

В заключение участники семинара утвердили основные направления комплексной программы «Молодежь как субъект и объект социально-политической трансформации общества» на предстоящее пятилетие.

# НАШИ «ЯНКИ» НЕ ХУЖЕ!

**Юрий СЕГИНЕВИЧ,**
**руководитель секции КВН ФОПа**

Если спросить студента университета, что такое КВН, то он, конечно, сразу же вспомнит А.Маслякова, а потом уже и команду КВН «Янки». Как оказалось, люди ее знают, и это показал концерт команды, собравший полный зал. Но ребята не только сделали концерт, они еще и попали в финал Высшей Лиги Белорусского КВН, причем вполне заслуженно. Это могут подтвердить болельщики команды, которые наблюдали весь путь команды в этом сезоне и поддерживали ее. «Янки» выражают огромную благодарность всем им и понимают, что без такой помощи они, возможно, сыграли бы хуже.

Теперь о самом финале. Подготовка к нему была не самой простой, хотелось показать, что Гродно - это вполне реальный претендент на победу. Но не хватило опыта, хотя выступление стало серьезной заявкой команды на будущий сезон. Встречались команды «Бывало и хуже» (сборная Вооруженных сил и Военной академии РБ), «Физмат и Компания» (сборная Могилева), «Янки» (Гродненский госуниверситет имени Янки Купалы) и сборная команда БГПА (г.Минск). Именно в таком порядке и распределились места в финале. И 3-е место - это не повод для огорчения, это показатель того, чего за один сезон может добиться команда КВН, если она в меру амбициозна и напориста, ну и, конечно, талантлива.

Есть надежда, что гродненцы продолжат борьбу в Высшей Лиге белорусского КВН 2000-го года. Помимо удачи, нашей команде необходима и финансовая поддержка спонсоров. Вся информация об играх и вообще о КВНе в Гродно есть на веб-странице «Янок» www.grsu.grodno.by/yanki. Также продолжается конкурс сценаристов. Все заявки присылайте на e-mail yanki@grsu.grodno.by, либо позвоните по телефону 44-50-54 и спросите Юру или Игоря - вам все объяснят.

Команда КВН ГрГУ «Янки» выражает благодарность администрации университета, профсоюзному комитету студентов, факультету общественных профессий и лично - ректору Сергею Александровичу Маскевичу за оказанную помощь и надеется на дальнейшее сотрудничество.

### ГРОДНЕНСКОМУ ГОСУДАРСТВЕННОМУ УНИВЕРСИТЕТУ – 60

# СПОРТИВНЫЙ ВЕЧЕР

В рамках подготовки к празднованию 60-летия вуза 17 декабря в актовом зале главного корпуса прошел спортивный вечер с интересной, насыщенной программой: подведение итогов спартакиад университета, города, вуза, Республики Беларусь, а также - участия студентов-спортсменов университета на Чемпионатах Республики Беларусь, Европы, Мира. В программе вечера прошли также встречи с выпускниками - чемпионами Европы, Мира, Олимпийских игр, показательные выступления. Завершился вечер большой концертной программой. За несколько дней до торжеств в коридоре, ведущем в актовый зал, были выставлены стенгазеты прошлых лет по спортивной тематике. С удовольствием читали и разглядывали их и студенты, и преподаватели, вспоминая былые дни - веселые, счастливые, с победами и успехами в спорте.



Людміла ДАНІЛАВА

# ЕЛАЧКА

## КАЗКА

У Матулі-Пушчы нарадзіліся дочкі-двайняты: Сасонка і Елачка. Раслі яны прыгожымі і разумнымі, апраналіся акуратна, з іголачкі. У лесе не было роўных ім па прыгажосці. Свае зялёныя іголачкі яны паліравалі да бляску, даглядалі свае галінкі. Таму Асенні вецер - гаспадар Пушчы - дазволіў яе дачушкам не мяняць увосень убор, не здымаць яго і ўзімку. Так і красаваліся лясныя прыгажуні круглы год. А птушкі разносілі па ўсім лесе славу аб іх прыгажосці, стромкасці ды гнуткасці.

- «Так-так-так», - трашчала Сарока. - Жаніхі ўжо гатовы ехаць у сваты.

- «Не-не-не», - ценькала Сінічка. - Маладыя яшчэ сястрычкі. Ды і гняздо маё на галінках Сасонкі. Вось як падрастуць мае дзеткі, тады няхай і сватаюць сясцёр.

- «Чык-чырык», - сказаў стары Верабей. - Няўжо вас спытаюць, калі вяселле гуляць?

- «Едуць, едуць!» - затрашчалі Сарокі. - Яны заўсёды першымі даведваліся пра ўсе лясныя навіны.

- «Са званочкам, з бубнамі, на тройцы добрых коней едуць», - неслі навіну далей Галкі. - У брычцы - два братцы-маладцы - Верасень і Кастрычнік.

Верасень папрасіў у Матулі-Пушчы руку і сэрца Сасонкі.

- Я згодна, адказала Пушча. - А вось што яна сама табе адкажа - не ведаю. Магу толькі параду даць. Дочкі мае - прыгожыя, а таму - ганарлівыя. Паспрабуй чым-небудзь здзівіць яе. Прынясі падарунак. Можа, спадабаецца Сасонцы...

Прынёс Верасень сваёй нявесце кошык грыбоў-маслючкоў і рассыпаў ёй пад ногі. Засмяялася Сасонка, спадабаўся ёй Верасень і яго шчодрасць. Паверыла, што будзе з ім жыццё і вясёлым, і заможным, што будуць яны радаваць грыбнікоў і масляткамі, і баравічкамі.

Кастрычнік-гарэза, як вядома, зрывае з дрэваў пажоўклае лісце, хістае голле. Не вельмі ласкава сустрэла яго Матуля-Пушча. Нахабнік! Зараз пачне распранаць дрэвы... Але Кастрычнік на гэты раз быў сама пяшчота. Пра такіх кажуць: хоць да раны прыкладай. Аднак Елачка не захацела пайсці за яго замуж. Адмовіла яна і наступным жаніхам - Лістападу і Снежню. Снежань застаўся пакрыўджаны: яшчэ маленькую Ялінку ён песціў і ўкутваў белым коўдрам, хаваў ад Марозу. А яна чакае нейкага заморскага прынца...

Матуля-Пушча пачала ўгаворваць ганарлівую дачку. А тая - у адно: буду чакаць заморскага прынца.

Варта сказаць, што Елачка вельмі любіла абновы і розныя ўпрыгожванні. Бывала, тры разы на дзень пад прамянямі Сонейка пераапранецца - то лёгкая газавая сукеначка на ёй, то багатае цёмназялёнае плацце з панбархату. Не паспявала Матуля збіраць грошы на тыя абновы. Мала таго - дачцэ патрэбны былі яшчэ і ўпрыгожванні да кожнай сукенкі. То завушніцы з бірузы, то сярэбраныя бранзалеты, то залатыя ланцужкі ды пярсцёнкі.

Вось аднойчы прыехаў у лес заморскі купец-маладзец. Бываў ён і ў Турцыі, і ў Кітаі, і ў іншых краінах. Шмат чаго бачыў, шмат чаго прывозіў з тых заморскіх краінаў. У Ялінкі аж сэрцайка зайшлося: колькі зіхатлівых тавараў у таго купца! Захацела Елачка замуж толькі за яго - за багатага купца-малайца, імя якому - Новы год. А той рассыпаў іскры-зоркі перад Матуляй-Пушчай, абяцаў дачку Елачку апрануць ва ўсё новае, зіхатлівае. Толькі ўмова была: Елачка павінна была пакінуць Пушчу і паехаць з маладым у горад. Яна і на такое згадзілася. А калі ссек Новы год Елачку, ды прынёс у горад, у кватэру, закапалі горкія слёзы з яе іголачак. Зразумела Елачка, што прамяняла яна сваю волю і родную Матулю-Пушчу на цесны душны пакой. І нават упрыгожванні, якімі абвесіў яе жаніх Новы год, не радавалі. А вось калі сабраліся дзеткі, ды сталі карагодам вакол Елачкі хадзіць, ды песні спяваць, тады і яна развесялілася. А ўвечары каля Елкі гулялі дарослыя, і яна - з імі. О! Гэта быў бляск!

Але свята закончылася, Новы год зноў адплыў у заморскія краіны, а з Ялінкі знялі ўсе ўпрыгожванні і выставілі яе ў снег на двары. У лес ёй ужо нельга было вярнуцца, і пачала яна плакаць, бо карані ж яе засталіся там, у пушчы. Ды так плакала, што разам са слязьмі пачалі падаць пажаўцелыя іголкі. Не толькі ўпрыгожванняў, але і звычайнай шэра-зялёнай сукеначкі не засталося на ганарлівай прыгажуні. Вось табе і заморскі прынц...

Усё ж Ялінка вельмі любіць святы, уборы і ўпрыгожванні. Так моцна любіць, што гатова згубіць усё, каб толькі пакрасавацца некалькі дзён ва ўсім бляску.

## КОЛОНКА РЕДАКТОРА

Вот и еще один год отсчитал календарь. На пороге Новый, 2000 год, юбилейный для ГрГУ. Редакция газеты «Гродзенскі універсітэт» последовательно освещала не только жизнь вуза, но и довольно успешно - подготовку к юбилейной дате. Весь год мы намерены не оставлять за бортом эту тему, потому что это - история.

Редакция благодарит профессора В.П.Тарантея за то, что он на протяжении 1999 года рассказывал нашим читателям о своих коллегах. Рассказывал живо, интересно, используя разные жанры - зарисовку, интервью. Виктор Петрович ни разу не подвел свою родную газету. Спасибо Вам, уважаемый профессор! Надеемся, что сотрудничество с прессой Вам в радость, и поэтому ждем новых творческих находок, ждем Ваших материалов. Надеемся также, что у газеты появятся новые постоянные авторы. Ведь каждому из Вас, дорогие читатели, есть о чем рассказать коллегам и студентам. Тем более, что есть такая прекрасная возможность - своя газета.

Редакция благодарит своего постоянного автора, старшего преподавателя кафедры физвоспитания О.И.Смолякова за оперативность, за уважение к читателям газеты. Хочется поблагодарить наших авторов-филологов доцентов П.И.Малявко, Т.М.Прудко, Н.А.Мельникова, старшего преподавателя Р.К.Козловского, которые не только охотно откликаются на просьбы редакции, но и находят студентов с творческой жилкой и помогают им написать первые статьи в газету. Приносят стихи студентов и, кто знает, может быть, с этих первых публикаций в университетской многотиражке начнется у ребят дорога в большую творческую жизнь.

За внимание к газете спасибо профессору И.П.Креню, доценту Ю.П.Золотухину и многим другим, кто хотя бы раз написал в свою родную безгонорарную многотиражку. Благодаря Вам, дорогие авторы, газета стала интересной, разносторонней, серьезной и полнокровной - таким и положено быть периодическому изданию классического университета.

Без вашего участия, уважаемые, газета была бы написана одним стилем, одной рукой, и вряд ли вызывала бы такой интерес и имела бы такую популярность, как сейчас. Читатели сетуют на то, что маловаты тираж и объем, но это уже - другая тема.

Счастья Вам, здоровья, творческих находок и успехов, дорогие авторы и читатели газеты. Ждем Вашим материалов, всегда будем им рады.

# З НАРОДНЫХ СКАРБАЎ

**Ужо трэці год запар пасля пэўнага перапынку студэнты беларускага аддзялення філалагічнага факультэта кожнае лета едуць на фальклорную практыку - збіраць вусную народную творчасць. З нататнікамі і самапіскамі, з магнітафонамі яны абыходзяць вёскі, слухаюць людзей, трапляюць у асяродак народнай аўтэнтычнасці, калі простыя вяскоўцы распавядаюць пра старыя часы, пра асілкаў і міфічных істотаў, успамінаюць песні продкаў, звычаі далёкай даўніны. Сёлета на працягу двух тыдняў (1-14 ліпеня) у трох раёнах Гродзеншчыны (Лідскім, Мастоўскім, Іўеўскім) знаходзіліся групы студэнтаў, а таксама індывідуальна збіраўся фальклор і ў іншых частках вобласці (Гродзенскім, Воранаўскім і Шчучынскім раёнах). За гэты час быў сабраны значны аб'ём твораў розных жанраў вуснай народнай творчасці, абрадаў, звычаяў, магнітафонныя запісы песень зафіксавалі старажытныя мелодыі ў арыгінальным выкананні. Копіі сабраных матэрыялаў перададзены ў Саюз фалькларыстаў Беларусі для кнігі «Фальклор у сучасных запісках. Гродзенская вобласць». На падставе твораў вуснай народнай творчасці, сабраных на фальклорных практыках студэнтамі і выкладчыкамі беларускага аддзялення філалагічнага факультэта на працягу апошніх трох гадоў, ужо ў бліжэйшы час плануецца падрыхтаваць першы выпуск кнігі «Фальклор Гродзеншчыны. Сучасныя запісы», што, дарэчы, адпавядае і планам працы кафедры беларускай літаратуры (паводле «Перспектыўнай праграмы вывучэння беларускага фальклору ў Гродзенскай вобласці», 1996). Сёлетняя практыка прайшла паспяхова. Яна дазволіць выконваць не толькі навучальныя і выхаваўчыя задачы, прывіць любоў да роднага слова, звычаяў, абрадаў, але таксама дапаможа зрабіць канкрэтныя крокі ў захаванні духоўнай спадчыны беларускага народа для наступных пакаленняў грамадзянаў нашай краіны.**

**Сабраць гэтую спадчыну - захаваць душу народа, пранесці праз гады і стагоддзі незлічоныя скарбы духу, скарбы, страта якіх вядзе да духоўнай пагібелі нацыі.**

**Р.КАЗЛОЎСКІ,**
**старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры, кіраўнік фальклорнай практыкі.**

## ПРЫПЕЎКІ

Ох, ох, не дай бог,
Любяць мяне ўчатырох.
Любіць Ясь, любіць Стась,
Любяць Бронусь і Міхась.

***

Ой, мілка мая,
Харошага стану.
А хто ж цябе любіць будзе,
Як я перастану?

**Запісалі Ю.БЯШЧУК, В.ОКАЛАВА, І.РАДЗІНСКАЯ, Т.ЦІХАНОВІЧ, Т.ШНЭЙДАР у в.Урцімкі Іўеўскага раёна.**

***

Ішоў дзед па грыбы,
А баба па апенькі.
Знайшоў дзед тры рублі,
А баба ні капейкі.

***

А што я старая,
Штосьці не верыцца.
Як гармонік зайграе,
На мне ўсё шавеліцца.

**Запісалі В.КУЕЛЬ, Ю.НЕМЕЦ, С.АКУДОВІЧ, Г.МАЛІЧ у в.Бабоўцы і в.Мееры Лідскага раёна.**

***

Ой, згубіла я пярсцёнак
У засеку, у муцэ.
Аказаўся мой пярсцёнак
У мілога на руцэ.

**Запісалі: Ю.ВАРОНІЧ, Н.ДАРАШУК, А.ЗЫБЕЛЬ, А.НЯЧАЙ, І.ФУРАВЕЦ, А.ЧАРНЕЦКАЯ ў в.Галубы Мастоўскага раёна.**

## ПРЫМАЎКІ І ПРЫКАЗКІ

- Лішняга і свінні не ядуць.
- П'яніца праспіцца, а дурань - ніколі.
- Чалавек без сябра, што яда без солі.
- Не той моцны, хто стрымлівае коней, а той, хто стрымлівае сябе.
- Дурны хутчэй хапаецца за агонь, чым за розум.
- Ад парады язык не адваліцца і зубы не высыплюцца.

**Запісалі: Ю.ВАРОНІЧ, Н.ДАРАНЧУК, А.ЗЫБЕНЬ, А.НЯЧАЙ, І.СУРАВЕЦ, А.ЧАРНЕЦКАЯ ў в.Галубы Мастоўскага раёна.**

***

- Баба доўгі волас мае, яна і чорта ашукае.
- Брэшуць, брэшуць - канца ім няма.
- Як пойдзеш замуж, дык як камень прывяжаш.
- Вольны, як пташык польны.
- Лепей чорту вер, як бабе.

**Запісалі: Н.ПІЛЮТКЕВІЧ, Т.ЗДАНОВІЧ, Н.ВЕЛІСЕЙЧЫК, С.СІДЛЯРЭВІЧ у в.Парачаны Лідскага раёна.**

## ПЕСНІ

Мы вясну шукаем,
Мы вясну шукаем.
Прыходзь, вясна,
З ручайком бурлівым,
З рэчкай гаманлівай!
Прыходзь, вясна,
Прыйдзі, прыйдзі, вясна
Прыйдзі, прыйдзі, красна,
К нам у талочак!
Прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
Каб сплесці вяночак.
Гэй! Вясна-красна!
Што ты там прынясла?
Прынасею я вам з карысці
ў радасці
Першае ў годзе - у лугах
малаводзе,
Другое ў годзе - усім вам
здароўя
А яшчэ першыя блакітныя
кветачкі...

**Запісалі студэнткі Н.АЎГУСЦІНОВІЧ, А.БАТУРА, Н.ВЫСОЦКАЯ, Т.СЕДЛЯР у в.Галубы Мастоўскага раёна.**

### ДЫВАНОЧАК

Хадзілі дзяўчаты лясамі,
Хадзілі дзяўчаты лугамі,
Хадзілі ў даль палявую.
Збіралі красу веснавую,
Шукалі крыніцу жывую.
Расцілі дзяўчаты ляночак
На нівы дыван-дываночак,
Хадзілі дзяўчаты на ровы,
Збіралі вячэрнія зоры,
Дыван каляровы скавалі,
Вясновымі ўзорамі ткалі.
Зайздросліва шчасця жадалі
Сяброўцы, што на дываночку
Стаяла ў шлюбным вяночку.

**Запісалі студэнткі М.КАНДРАТОВІЧ, М.ПЛЯЦАК, В.СМАЛЕЙ.**

## ВАРАЖБА НА ВАРВАРУ

Трэба пасціцца цэлы дзень, а на ноч з'есці кавалачак сялёдкі і легчы спаць. Ноччу прыйдзе жаніх, прынясе вады папіць.

*(Варвара адзначаецца за 6 тыдняў перад Калядамі).*

**Запісала: С.РАПЕЦКАЯ ў в.Губінка Гродзенскага раёна.**

## ВАРАЖБА НА КАЛЯДЫ

Дзеўка выходзіць на двор і бярэ ў ахапку бярэмя дроў. Потым лічыць: як пара - будзе кавалер, калі лішка - будзе ўдава.

**Запісала: С.РАПЕЦКАЯ, Гродзенская вобласць, Гродзенскі раён, в.Губінка.**

***

На Каляды трэба абысці тры разы вакол трох калодзежаў, пасеяць канаплю, і, нікому не кажучы, легчы спаць. Павінен прысніцца суджаны.

Самсон, Самсон, адгані
мне сон
Дай, Божа, знаці,
З кім буду век векаваці.

Пры гэтых словах трэба глядзець на месяц.

**Запісалі: В.КУЕЛЬ, Ю.НЕМЕЦ, С.АКУДОВІЧ, Т.МАЛІЧ у в.Мееры Лідскага раёна.**

## ЗАМОВА

У нядзелю раненька
сонейка ўсхадзіла.
Святая матка па касцёле
хадзіла,
Свайго сыночка за ручку
вадзіла,
З касцёла на пацёра на Мша.
На тым моры стаіць столік,
на століку крыжык.
На крыжыку Езус,
Галоўку скланіўшы,
Пяць раз адтварыўшы.
Прыйшла святая Матка:
«Езу, Езу, што ты тут
парабляеш,
Калі жалуеш, мілуеш,
Раскажы старому (малому),
Няхай там ад хваробы
паздаровіць. (Імя)

**Запісалі: В.УРБАНОВІЧ, М.ПЛАЦЯК, В.СМАЛЕЙ, М.КАНДРАТОВІЧ у в.Пераганы Лідскага раёна.**

## ЗАГАДКІ

За белым бярэзнічкам
Галалайчык скача.
*(язык)*

***

Шах-мах па кутох -
У пароге спаць лёг.
*(венік)*

**Запісалі: В.КІЗІЛЕВІЧ, Ю.РЭКЕЦЬ, С.СІГЕЛЕВА ў в.Радзівонішкі Лідскага раёна.**

# СПОРТИВНЫЙ КАЛЕЙДОСКОП

РУБРИКУ ВЕДЕТ СТАРШИЙ ПРЕПОДАВАТЕЛЬ КАФЕДРЫ ФИЗВОСПИТАНИЯ О.СМОЛЯКОВ

## ПРИЗ ЗАВОЕВАЛИ ИСТОРИКИ

Две недели в спортивном зале университета шли упорные поединки сборных мужских баскетбольных команд факультетов, участниц соревнований в программе университетской спартакиады. Девять команд оспаривали первенство. Борьба шла за командное первенство и за личные призы, учрежденные олимпийским чемпионом Иваном Едешко и его братом, участником пяти спартакиад республики, ст. преподавателем кафедры физвоспитания Е.Едешко. После стартовых матчей определились четыре команды, которые и повели спор за победу и за призовые места первенства. По семь побед и по одному поражению оказалось у двух команд. Все решила игра между ними. Победу праздновали будущие историки, сумевшие победить команду юрфака - 43:39. Вот как историки шли к победе. Они нанесли поражения: психологам - 56:32, команде гуманитарного факультета - 43:40, биологам - 55:43, команде физико-технического факультета - 48:32, математикам - 52:33 и филологам - 53:45. Только раз ушли с площадки побежденными, уступив команде факультета экономики и управления - 31:37. А вот те, кто привел команду к победе: Юрий Борисенко, Владимир Чаплюк, Валерий Лухтан, Алексей Матвеев, Павел Сикорский, Андрей Амбожевич, Евгений Дудко, Дмитрий Ребковец, Виктор Бахонский (зам. декана по спорту В.Иванов).

На вторую ступень пьедестала почета поднялись юристы (зам. декана по спорту А. Кудель), на третью - команда физико-технического факультета (зам. декана по спорту Н.Ожогин). Далее места распределились в следующем порядке: факультет экономики и управления, гуманитарный факультет, филологи, математики, биологи и команда факультета психологии и педагогики.

Призы, учрежденные олимпийским чемпионом И.Едешко, вручены: лучшему защитнику Сергею Савинкову (физико-технический факультет), лучшему нападающему Михаилу Линькову (факультет психологии и педагогики). Приз тренерских симпатий получил Виталий Шарейко (юрфак), приз «За волю к победе» получил Михаил Мазур (юрфак).

Команды, занявшие призовые места, награждены призами и дипломами спортивного клуба университета. Переходящий приз за победу получил годичную прописку в деканате истфака.

## «ЗОЛОТО» ВОЛЕЙБОЛИСТОВ

В финале волейбольного турнира в программе студенческих игр страны принимали участие восемь сильнейших команд вузов республики, победителей в своих зонах.

В предварительном турнире волейболисты нашего университета нанесли поражение команде политехнической академии - 3:1, Оршанскому коммерческому университету - 3:2 и уступили команде Гомельского университета - 1:3, заняли в своей подгруппе II место.

В полуфинале гродненцы легко обыграли команду Могилевского университета - 3:1, а во втором полуфинале команда Белорусской академии физической культуры нанесла поражение гомельчанам - 3:1.

И вот финал: наш университет - академия физической культуры (Минск). Наши ребята отлично провели этот поединок, победив минчан в трех партиях, завоевали звание чемпионов вузов Беларуси 1999 года.

«Бронза» у могилевчан, четвертое место завоевали волейболисты Гомеля, на пятом месте - команда университета транспорта из Гомеля, далее идут команды БГУ, Орши и политехнической академии.

За нашу команду выступали А.Будько, А.Щетков, А.Косцов, А.Черняк, А.Захарчук, А.Мельченко, Э.Венский, В.Дубровщик, А.Обуховский и А.Якуцевич.

Большой похвалы заслуживает и тренер, готовивший команду, старший преподаватель кафедры спортивных игр С.Кириллов.

## «ВОЛЬНИКИ» НА ПЬЕДЕСТАЛЕ

Минск был местом проведения соревнований по вольной борьбе в программе Республиканских спортивных студенческих игр.

Команды двадцати трех вузов страны два дня вели спор за первенство и за победу в личном первенстве в восьми весовых категориях.

Два первых, два вторых места и третье командное место - таков итог выступления наших борцов. На высшую ступень пьедестала почета поднялись: Олег Седач (вес 69 кг) и Андрей Кондратович (вес 130 кг). Уступив своим соперникам в финале, «серебро» завоевали: Александр Каминский (вес 58 кг) и Сергей Кревчик (вес 97 кг).

Радость успешного выступления «вольников» разделяет и тренер, готовивший команду, старший преподаватель кафедры физвоспитания И.Боярчук.

## ТУРНИР ГАНДБОЛИСТОК

Слоним принимал молодежные женские команды гандболисток, участниц международного турнира. В этих соревнованиях принимали участие и команды университета.

Дружина, возглавляемая заслуженным тренером РБ, старшим преподавателем М.Бурой, обыграла вторую команду «Университет-УОР» и сборную молодежную страны, а вот сборной Литвы уступила - 22:27 и заняла второе место.

Эти соревнования были хорошей подготовкой нашей команды перед чемпионатом республики, где она принимает участие. После первого тура наши девушки на третьем месте.

Определена сборная молодежная команда Беларуси, которая примет участие в чемпионате Европы среди молодежи. В нее вошли и наши студентки - А.Почерило, Н.Платонович.

Лучшими игроками в нашей команде в Слониме были Н.Желнова, А.Сидорик и О.Володащик.

# ТЕМ, КТО ЛЮБИТ ПУШКИНА

**Т.АВТУХОВИЧ,**
**заведующая кафедрой русской и зарубежной литературы**

В рамках недели науки-99 кафедра русской и зарубежной литературы провела Пушкинские чтения. Они проходили необычно: в списке докладчиков значились не только студенты, преподаватели, но также школьники и учителя г.Гродно и области. Всех их объединило желание сказать свое слово о Пушкине - стихи, рефераты, научные исследования сменяли друг друга.




Пушкинские чтения увенчались изданием сборника «Сбирайтесь иногда читать мой свиток верный...», который к 200-летию А.С.Пушкина выпустил областной институт повышения квалификации и переподготовки руководящих работников и специалистов образования.

В разделе «Читая Пушкина» представлены доклады студентов филфака ГрГУ С.Божок - «Пушкин и Баратынский. Типология элегического жанра», Е.Лягушиной - «Театральные ситуации в романе А.С.Пушкина «Евгений Онегин», С.Архиповой - «Лексико-семантическое поле «Пушкин в восприятии М.Цветаевой», С.Рыжова - «Стихотворение Пушкина «К Овидию» (1821 г.), Т.Рябченко - «А.С.Пушкин и Анакреонт: к проблеме литературного контакта», В.Коротельщиковой - «Оппозиция «Вечность-миг» в лирике А.С.Пушкина и М.Ю.Лермонтова», М.Кондратович - «Пушкін у перакладах беларускіх пісьменнікаў».

Материалы сборника, прекрасно дополняя друг друга, дают цельное представление о нашем восприятии Пушкина и его творчества. Вот почему, надо думать, книга не только станет венком к юбилею поэта, но и постоянным спутником студентов, аспирантов, учителей, всех тех, кто любит Пушкина.

# ГОД ДРАКОНА



Не так уж много в нашей жизни настоящих праздников. Не так уж часто посещает нас госпожа Удача. И как хочется хоть что-то просчитать наперед, приоткрыть завесу будущего, чтобы знать, как себя вести, когда привалит счастье или, наоборот, настигнет неудача. Если бы мы могли заглянуть в будущее, наверное, в нашей жизни было бы меньше разочарований. Может быть, поэтому так популярны во всем мире восточные гороскопы, следуя которым каждый год принадлежит какому-либо животному, и, конечно же, повторяет его характер и повадки.

Год 2000-й - год Дракона. Дракон постоянно сверкает, но его блеск не столь ярок, что от него можно ослепнуть. Его сильная личность - только видимость. Он не существует реально. Это животное для народа, для праздника, тип карнавальной фигуры, безмятежной и могущественной. Но каждая медаль имеет свою оборотную сторону, и если возникает впечатление легкой судьбы у Дракона, не забудьте, что это - иллюзия. Однако все же этот знак - знак удачи, небесного могущества и самого благородного астрологического влияния. Дракон приносит четыре благополучия: богатство, добродетель, гармонию и долголетие.

Будьте честолюбивым и предприимчивым, идите вперед. Изматывающий год. Блестящий год. Грандиозные победы или поражения. Предостережение против пожаров. Год, благоприятный для блестящих успехов на войне или в какой-либо другой области, как, например, политической. Но эти успехи в основном иллюзорны. Если Ваш ребенок родился Драконом, не беспокойтесь за него.

Что сулит год Дракона людям, родившимся под другими знаками?

**КРЫСА.** Этот год подходит для Крысы. Она займется хорошими делами и будет спокойна.

**БЫК.** Успокоенный пышностью и блеском, он подумает, что вернулись добрые времена. Но это только иллюзии. Пусть он лучше работает.

**ТИГР.** Для него этот год будет напряженным. В годе Дракона есть блеск. А Тигр любит его.

**КОТ.** Будет довольно посматривать на все это волнение. Он останется у себя и займется делами.

**ДРАКОН.** Счастлив, как рыба в воде. Это год его успеха!

**ЗМЕЯ.** Мудрость удерживает ее от беспокойства при виде всей этой суеты. Все спокойно, все хорошо. Жизнь улыбается ей.

**ЛОШАДЬ.** Этот год будет неплохим для нее. Она любит парады. Она будет весьма удовлетворена.

**КОЗА.** Отовсюду и понемножку она воспользуется всем этим блеском и будет чувствовать себя неплохо.

**ОБЕЗЬЯНА.** Как она развлекается! Ее роль будет главной: Дракон нуждается в ней.

**ПЕТУХ.** Он может любезничать, сколько ему влезет. Этот год ему подходит. Пусть он вступает в брак.

**СОБАКА.** Все это вызовет в ней отчаяние и покажется бесполезным. Пусть она держится в стороне.

**СВИНЬЯ.** Уверенная в том, что может жить проще и скромнее, Свинья найдет убежище у своих друзей. Пышность угнетает ее.

# АСТРОПРОГНОЗ НА ЯНВАРЬ

**ОВНЫ.** Знак огня, под покровительством Марса. Характер сильный. Оптимизм, честолюбие помогут достичь цели. Но мешает некоторая импульсивность, склонность к преувеличению.

**ТЕЛЬЦЫ.** Знак земли под покровительством Венеры. Характер противоречивый, натура эмоциональная. Благодаря силе и трезвому уму у Тельцов прекрасно складываются дела на службе, в учебе. Но не стоит упрямиться по мелочам: это помешает быть счастливыми.

**БЛИЗНЕЦЫ.** Знак воздуха. Под покровительством Меркурия. Характер отличается неопределенностью, раздвоенностью. Это помешает достигнуть желаемого. Разносторонние интересы и любопытство Близнецов помогут неплохо организовать досуг. А вот учеба, работа - это отойдет на второй план.

**РАКИ.** Знак воды под покровительством Луны. Характер открытый, натура мечтательная. Обостренная интуиция позволит заранее раскрыть козни недругов и посмеяться над ними. Неплохая финансовая партия.

**ЛЬВЫ.** Знак огня под покровительством Солнца. Характер властный, натура богатая. К сожалению, январь не сулит ощутимых успехов. Особенно в денежном выражении. Ждите. Ваше время придет.

**ДЕВЫ.** Знак земли. Ум практический, характер глубокий. Знак Девы - знак реальности, логики, ясности. В январе предстоит решать конкретные вопросы, которые в будущем сулят прибыль. Улучшится здоровье.

**ВЕСЫ.** Знак воздуха. Под покровительством Венеры. Характер легкий, ум ясный. В учебе все складывается как нельзя лучше. Чего не скажешь об отношениях с друзьями и близкими.

**СКОРПИОНЫ.** Знак воды. Под покровительством Марса и Нептуна - сила и жестокость плюс могущество. Скорпион будет бороться, страдать и... пожирать сам себя. Он будет привлекательным, хотя и жестоким.

**СТРЕЛЬЦЫ.** Знак огня. Под покровительством Юпитера. Философствуйте! Это принесет результат. Удача близко. Поберегите нервы. Чревато. Обходите грубых людей.

**КОЗЕРОГИ.** Знак земли. Планета - Сатурн. Упрямы и выносливы. Благодаря этим качествам смогут пережить потрясения, которые им уготованы в первой декаде. К концу месяца - приятная долгожданная весточка, способная многое изменить в жизни.

**ВОДОЛЕИ.** Знак воздуха. Под покровительством Сатурна и Урана. Эмоциональны, впечатлительны. Сатурн в январе обрекает Водолея на покорность судьбе, которую не назовешь счастливой. Все изменится к лучшему: вернется старый друг с новыми интересными предложениями.

**РЫБЫ.** Знак воды. Под покровительством Юпитера и Нептуна. Характер таинственный. Тонкая интуиция. Нептун придает беспокойство. Прекратите борьбу сами с собой. Вы получите то, что хотите. Только будьте помягче со своими родными и близкими.

*Рэдактар* Людміла Мікалаеўна ДАНІЛАВА

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы.*
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і надрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.
ЛП № 111 ад 29.12.97 г.
Вул. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна.

*Набор і вёрстка:* М. ВЕРСТАК, В. ЗАКРЭЎСКІ.
*Фота:* Ул.САРОКІН.
*Карэктура:* Н. ДУДКО.

*Здадзена ў набор 14.12.99.*
*Падпісана да друку: 24.12.99. 15.00*
*Заказ № 168*

Аб'ём - 1 ум. друк.арк.
Наклад 500 асобнікаў.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* 230023, г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.